Маціеўскі, М. Зямля не замыкаецца за спіной / М. Маціеўскі // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1989. — 17 студз. — С. 2—3.

ЗЯМЛЯ НЕ ЗАМЫКАЕЦЦА ЗА СПІНОЙ

Не з адным хлопцам, служыўшым у Афганістане, давялося сустракацца. Розныя трапляліся – разгаворлівыя і маўчуны, сапраўдныя волаты і непрыкметныя з выгляду. Але вось усе яны – хто сам, хто з маёй «падказкі» – прызнаваліся, што цяпер іх жыццё мае тры дакладна раздзеленыя паласы – да службы, сама служба і пасля службы. Вядома, раздзелены яны сімвалічна, паколькі сувязі тут, калі ўдумацца, больш адчувальныя, чым адрозненні. А ўсё ж...

Што сказаць пра Валерыя Ганчарова, пра яго жыццё да арміі? Закончыў школу, працаваў трактарыстам у родным саўгасе «Пачаевічы». Працаваў добра, хвалілі. Словам, хлопец быў як хлопец. Не любіў ад кагосьці залежыць, умеў пастаяць за сябе, цаніў таварыства і пастаянства ў чалавечых адносінах. Урэшце, усё гэта можна з поспехам аднесці і да Ганчарова – сённяшняга. Але для нас не лішне заўважыць, што такім ён быў ужо тады, калі перакрочваў у новую паласу жыцця.

Амаль кожны, у каго армейская служба ўжо ззаду або на заходзе, пацвердзіць, што самым цяжкім у ёй быў пачатак. Паспрабуй, на самай справе, у адначассе развітацца з мноствам прывычак, напрыклад, з ранку панежыцца ў ложку, або настойліва выкладаць свае рэзоны, замест рубленага «Ёсць!» І, насуперак, без усялякіх размоў прыняць да выканання правілы, асобныя з якіх зусім не здаюцца бессардэчнымі. Не адзін месяц пройдзе, пакуль асвоішся і зразумееш мудрую жорсткасць слова: «Трэба».

І як выручала яно потым, калі ў думках часам неадвязна вярцелася: «Усё, кропка. Болей не магу...»

«Трэба!»

Воінская часць, куды прыбылі маладыя салдаты, нягледзячы на восень, сустрэла з гарачым ветрам, пяскамі, якія прасціраліся наўкола. Самота ды толькі – воку няма за што зачапіцца. Няўжо, уздыхалі яны, тут жыць можна?

«Трэба!»

Трэніроўкі, заняткі – заняткі, трэніроўкі. Нялёгка было ім ажыццяўляць маршы ў выпаленых дарогах гор, збіваць ногі ў каменных завалах, задыхаючыся ад вышыні.

«Трэба!»

Верна заключыў мудрэц: самы магутны пабуджальнік да дзеяння – жалезная рука неабходнасці.

Ужо ў першым жорсткім баі з душманамі гранатамётчык выдатна ўсвядоміў, як патрэбны ён і яго таварышы тут, на зраненай, стомленай ад жорсткасці зямлі.

Мы сядзім з Валерыем у рэдакцыйным кабінеце, куды ён прыйшоў па маёй просьбе, нетаропка размаўляем. Прывабны юнак, стройны, падцягнуты. Валерый з ахвотай расказвае аб сваёй службе ў Афганістане, прыгадвае баявыя эпізоды.

..У той дзень падраздзяленне, у якім служыў Валерый Ганчароў, вярталася з баявога задання. Да знаёмага перавалу, за якім знаходзілася месца дыслакацыі, было рукой падаць, калі нечакана раздаліся выстралы.

Валерый кінуўся на зямлю і перакаціўся метры на тры ўлева. Колькі нападаўшых і адкуль яны вядуць агонь? Валерый заўважыць не паспеў. Мяркуючы па ўсяму, засада перакрывала падраздзяленню дарогу. Ззаду застукалі аўтаматы. Сітуацыя складвалася нявыгадная. Аднак камандзір падраздзялення нездарма лічыўся «майстрам» горнага бою. І цяпер ён не разгубіўся, знайшоў выйсце.

Разлічваючы на нечаканасць нападзення, бандыты не ўзялі пад кантроль адну-адзіную невялікую вышыню, якая «панавала» над мясцовасцю. І пралічыліся. Хутка арганізаваўшы баявое прыкрыццё, камандзір узвода падаў каманду: дробнымі групамі па чарзе прабівацца пад ахову збавіцельных валуноў. Неўзабаве ўзвод у поўным саставе заняў абарону на плоскай вяршыні.

Але ж надта шмат душманаў вакол, надта інтэнсіўны іх агонь. Асабліва ў напрамку, адкуль біў, не даючы ворагу узняць галавы, гранатамёт Валерыя Ганчарова.

Марудна ішоў час. Нетаропка плыло да небасхілу сонца. А бой ўсё грымеў. Ужо не адзін бандыт знайшоў сваю смерць на гэтай вяршыні, але кулі душманаў дастаюць і нашых байцоў. Вось ціха войкнуў адзін з іх, другі, прама ў скроню трапіла куля трэцяму...

Валерый іншы раз лавіў сябе на думцы, што яму нясцерпна хочацца ўзняцца ва ўвесь рост і кінуцца на ворагаў, туды ўніз, каб прабіцца, прарваць заслон, выратаваць баявых таварышаў. Але ж загад камандзіра папярэджваў: трымацца за валунамі. І толькі, калі дыск сонца апусціўся за вострыя заснежаныя вяршыні, нашым байцам прыйшла дапамога. Ні адзін душман не пазбег расплаты.

Часта аб узаемавыручцы, таварыскасці мы гаворым – і справядліва! – як аб якасцях асаблівых, вартасцях з вартасцей. Але часам жыццё ставіць людзей у такія ўмовы, калі ўзаемавыручка становіцца патрэбай і абавязковай умовай. Менавіта так ў Афганістане. «Прыкрыць спіну» таварышу, вынесці з-пад агню раненага, раздзяліць на дваіх апошні глыток вады. Армейская таварыскасць шанавалася і пацвярджалася рускім салдатам.

– Дэвіз «Сам загінь, а таварыша выручай», – гаворыць Валерый, – гэта для воінаў-інтэрнацыяналістаў былі не проста словы, а жыццёвая неабходнасць. Без гэтага ў баю немагчыма. Кожны з нас адчуваў у баю побач з сабой надзейнае плячо таварыша, сапраўднага мужчыны. Менавіта ў арміі я адчуў сябе мужчынам, пазнаў, што такое сяброўства.

Валерый задумаўся, замаўчаў на некалькі хвілін, а потым зноў загаварыў:

– І сёння часта сніцца Афганістан. Асабліва афганскія дзеці. Па-руску ведаюць хіба толькі «хлеб» і «спасибо». Мы заўсёды прыберагалі па лустачцы для чарнавокіх гаўрошаў. Ды што ім тыя лустачкі?! Усадзіць бы іх усіх за доўгі бацькоўскі стол, на якім і аладкі, і варэнне...

Валерый Ганчароў шмат ужо спасцігнуў у сваім жыцці, хоць яму крыху больш дваццаці. Чалавек ён мужны, загартаваны ў баях. Аб гэтым сведчаць і медаль «За адвагу», і афганскі баявы медаль. З гонарам выканаў Валерый свой інтэрнацыянальны абавязак, не сароміў высокае званне савецкага салдата. І пры захопе нашымі воінамі склада з боепрыпасамі, дзе для душманаў было завезена звыш тысячы рэактыўных снарадаў. І тады, калі іх узвод за дзве гадзіны ўзяў у палон звыш дваццаці душманаў, і ў многіх іншых баявых сутычках з бандытамі гранатамётчык Валерый Ганчароў нязменна быў наперадзе. Больш чым у трыццаці баях з душманамі прымаў ён удзел, не раз глядзеў смерці ў твар.

І ніколі не выкрасліць з памяці Валерыю вогненныя дні і ночы службы ў Афганістане, не сцерці у памяці твару загінуўшага таварыша, які толькі што, якую гадзіну назад, пісаў пісьмо

каханай. А хіба можна забыць бяздонныя, поўныя болю вочы афганскага хлопчыка, які стаяў на парозе разбуранага душманамі дома! Дома, пад развалінамі якога пахаваны яго маці і сястра...

Ён многае зведаў, перажыў у Афганістане, змяніўся за час службы. Не знешне, вядома. Хоць і гэта прыкметна. Узмужнеў. Стаў Больш разважлівым, абдумваючы кожнае сваё слова, кожны ўчынак.

Валерый Ганчароў навучыўся пераносіць цяжкасці. А яшчэ больш – любіць Радзіму, жыццё, сяброў па працы.

Смяртэльная небяспека, якая так часта падпільноўвала яго ў змаганні з душманскімі бандамі ў Афганістане, загартавала характар, волю гэтага звычайнага вясковага юнака са звычайнай сялянскай сям'і.

М. Маціеўскі